# Змест

## Гісторыя

*Гагуа Руслан*
Грунвальдская бітва ў паведамленнях
Энеа Сільвіа Пікаламіні ........ 2
*Цесельскі Томаш*
Попісы войска Вялікага Княства Літоўскага каля
гарадоў Рось і Заблудаў у верасні 1744 г. ........ 9
*Бортнік Ігар*
Праблема дзяржаўна-палітычнага ўладкавання ў
ананімнай працы “Размова Паляка з Літвінам” ........ 24
*Пашкевіч Аляксандр, Чарнякевіч Андрэй*
«Бацька» беларускіх паланафілаў ........ 37
*Пашкевіч Аляксандр*
Чалавек з-за шырмы: спроба высвятлення таямніцы “Старога” ........ 59
*Грыбоўскі Юры*
Рада БНР на эміграцыі і праекты інтэграцыі Цэнтральна-Усходняй
Еўропы ў 1945-1956 г. ........ 88
*Жарская Настасся*
Чарнобыльская аварыя ў памяці жыхароў в. Вохар
(Чэрыкаўскі раён, Магілёўская вобласць) ........ 102

## Пераклад

*Томпсан Эва*
Імперская веда: расейскі гістарычны наратыў
(пераклад Таццяны Нядбай) ........ 119

## Рэцэнзія

*Шыбека Захар*
Мястэчка Тураў праз павелічальнае
шкло ізраільскага гісторыка ........ 138

## Кніжны анонс

*Сінчук Іван* ........ 142

# Гісторыя

***Руслан Гагуа ,***
***кандыдат гіст. навук (Пінск)***

## Грунвальдская бітва ў паведамленнях Энеа Сільвіа Пікаламіні

Грунвальдская бітва – адна з буйнейшых у сярэднявеччы, адбылася 15 ліпеня 1410 г і адыграла значную ролю ў гісторыі Польшчы, Літвы і Беларусі. Ёй прысвечаны сотні навуковых, папулярных і мастацкіх прац і твораў, аднак шэраг пытанняў, якія датычацца бітвы, дагэтуль маюць дыскусійны характар. Гэта звязана перш за ўсё з тым, што пры правядзенні даследаванняў гісторыкі аддаюць перавагу сведчанням розных крыніц у залежнасці ад сваіх уласных поглядаў і таго, якія крыніцы яны вызначаюць у якасці базавых для сабе.

Некаторыя крыніцы ўвогуле застаюцца па-за ўвагай даследчыкаў, нягледзячы на тое, што яны дазваляюць вырашыць пэўныя спрэчныя пытанні адносна рэканструкцыі Грунвальдскіх падзей. Так, паведамленні Энеа Сільвіа Пікаламіні пра Грунвальдскую бітву амаль не выкарыстоўваюцца ў гістарычных працах. У той жа час аналіз яго рэляцый дазваляе прыйсці да высновы, што яны маюць значную даследчую каштоўнасць у якасці крыніцы для вывучэння Грунвальдскай бітвы.

Энеа Сільвіа Пікаламіні, выдатны рэлігійны і палітычны дзеяч 15 ст., нарадзіўся 18 кастрычніка 1405 г. у Піенцы, паблізу італьянскага горада Сіена і памёр 14 жніўня 1464 г. у Анконе. За свае амаль 59 гадоў жыцця ён зрабіў бліскучую палітычную і царкоўную кар'еру. Пачынаючы з 1430 г., Пікаламіні выконваў функцыі сакратара трох біскупаў і трох кардыналаў, выявіўшы пры гэтым вялікія дыпламатычныя здольнасці. Ва ўзросце дваццаці шасці гадоў ён прыняў удзел у Базельскім саборы 1431 – 1449 г., дзе здабыў вядомасць, дзякуючы прамоўніцкаму мастацтву, у якім, па сведчанні шэрагу сучаснікаў, не меў сабе роўных.

Пікаламіні служыў сакратаром у шматлікіх уплывовых асобаў, уключна з "антыпапам" Феліксам V і імператарам Фрыдрыхам III, з рук якога атрымаў у 1442 г. лаўровы вянок паэта. Дзякуючы яго намаганням, Фрыдрых III стаў на бок Рымскага Пантыфіка Мікалая V у яго супрацьстаянні з Базельскім саборам.

Сваю царкоўную кар’еру Энеа Сільвіа Пікаламіні пачаў у 1446 г. з пасады памочніка дзяка, але ўжо ў наступным 1447 г. быў узведзены ў сан біскупа. Мінуўшы дзевяць гадоў, у 1456 г. Пікаламіні стаў кардыналам, а яшчэ праз два гады – у 1458 г., пасля бурнага пасяджэння канклаву кардыналаў быў абраны Вярхоўным Пантыфікам пад імем Пія ІІ. У якасці кіраўніка Святой Рымскай Каталіцкай Царквы ён набыў славу аднаго з самых актыўных пап-рэфарматараў 15 ст., які выступаў з ідэямі арганізацыі новага крыжовага паходу з мэтай вызвалення хрысціянскіх народаў ад пагрозы заняволення Асманскай імперыяй.

Аднак Энеа Сільвіа Пікаламіні атрымаў шырокую вядомасць не толькі як рэлігійны і палітычны дзеяч: ён славуты таксама сваімі літаратурнымі творамі. Адмысловае прызнанне яму прынесла навела “Балада пра двух палюбоўнікаў”, якая ў перакладзе на нямецкую мову аж да сярэдзіны 15 ст. заставалася адной з самых папулярных кніг на ўсёй тэрыторыі Нямеччыны.

Адмысловае месца ў літаратурнай спадчыне Пія ІІ займаюць яго гістарычныя, геаграфічна-этнаграфічныя, а таксама біяграфічныя творы. У нашым выпадку цікавасць уяўляюць працы, якія маюць адносіны да гісторыі Прусіі і змяшчаюць паведамленні пра бітву пры Грунвальдзе. Энеа Сільвіа Пікаламіні быў актыўна задзейнічаны ў судовых працэсах, якія Тэўтонскі ордэн вёў пры імператарскім двары супраць Звязу прускіх гарадоў у 1453 г., а таксама ў дыпламатычных перамовах, прывёўшых да пачатку так званай Трынаццацігадовай вайны 1454 – 1466 г. І калі зварот Энеа Сільвіа Пікаламіні да старажытнай прускай гісторыі ўяўляе сабой запазычанне з твораў Пталемея або Іардана, дапоўненае даволі вольным пераказам мясцовых легендаў і міфаў, а часам і проста здагадкамі аўтара, то апісанне сучасных Пію ІІ гістарычных падзей носіць большай часткай мемуарны характар. Пры апісанні адносінаў паміж Польскім Каралеўствам, Вялікім Княствам Літоўскім і Тэўтонскім ордэнам Энеа Сільвіа Пікаламіні кіраваўся асабістымі назіраннямі і апавяданнямі відавочцаў, у тым ліку, верагодна, сведчаннямі некаторых непасрэдных удзельнікаў Грунвальдскай бітвы. Дадзеная здагадка пацвярджаецца таксама той акалічнасцю, што Пій ІІ паказаў значна лепшую знаёмасць з падзеямі бітвы пры Грунвальдзе, чым іншыя заходнееўрапейскія храністы таго часу.

Рэляцыі Энеа Сільвіа Пікаламіні пра Грунвальдскую бітву ўтрымліваюцца ў некалькіх яго творах і істотна адрозніваюцца па свайму аб’ёму, хоць у змястоўнай частцы маюць значнае падабенства.

Лаканічны запіс пра бітву быў змешчана ім у працы “Энеа Сільвіа біскуп сіенскі пра землі і паходжанне прусаў” (“Enee Silvii episcope Senensis de situ et origine Pruthenorum”). Ён утрымлівае толькі кароткую згадку пра бітву і спадарожныя падзеі і мала чым адрозніваецца ад паведамленняў большасці заходнееўрапейскіх летапісцаў:

"Нарэшце бацькам нашым памятны Ўладзіслаў, народамі які кіраваў мудра і вялікай душы і культу рэлігійнага годны, вайну абвясціў (Ордэну). І неадкладна памкнуўся да бітвы і Вітаўта, брата свайго, вялікага літоўскага князя, на дапамогу заклікаў, мужа свайго часу – вельмі суворага і хітрасці поўнага. Бітва ў ліпень месяц адбылася, біліся ў найважнейшай бітве, днём Марс невыразна на чыім боку быў, таму там шматлікія забітыя былі, урэшце, палі ахвярамі ордэнскія [браты]. Шэсцьсот вершнікаў роду шляхетнага ў бітве паляглі, людзей жа простых без ліку загінула. Пераможца польскі авалодаў усёй Прусіяй, ордэнскі замак Панны Марыі ў аблогу ўзяў. Але ўмяшаннем Жыгімонта імператара правінцыя братоў была адноўлена, золата каралю далі, [і] дамову з абодвух бакоў увесь час парушалі".[1]

Дадзенае апісанне было зроблена Пікаламіні, калі ён займаў біскупскую кафедру ў Сіене, гэта значыць паміж 1450 і 1456 г. Яно нязначна карацейшае за запіс у больш раннім творы будучага пантыфіка, што змяшчае кароткія біяграфіі шэрагу выдатных яго сучаснікаў – "Пра мужоў знакамітых" ("De viris illustribus"). У дадзеным творы, які быў створаны верагодна ў другой палове 1440-ых г., Энеа Сільвіа Пікаламіні паведамляе, што палякі былі акружаныя крыжакамі раней, чым паспелі пастроіцца. Аднак крыжакі не пажадалі скарыстацца зручным выпадкам і праз герольдаў выклікалі саперніка на бой. Паслы прынеслі Ягайлу рыцарскую рукавіцу, а Вітаўту – меч. Вітаўт адказаў паслам у рэзкай форме. Калі ж палякі былі пабітыя і пусціліся наўцёкі, князь натхніў свае войска на бітву, загадаў палякам аднавіць бой і разграміў ворага. У бітве палягло 400 рыцараў Тэўтонскага ордэна.

Значна больш падрабязныя і інфарматыўныя сведчанні пра Грунвальд прадстаўленыя ў іншым творы Пія II – "Пра Еўропу" ("De Europa"), складовымі часткамі якога з'яўляюцца раздзелы "Пра Лівонію" ("De Livonia") і "Пра Прусаў" ("De Pruthenis"). Праца "Пра Еўропу" была напісаная з выкарыстаннем аповядаў нейкага прапаведніка, доўгі час вёўшага місіянерскую дзейнасць у Літве, з якім Энеа Сільвіа Пікаламіні сустракаўся падчас працы Базельскага царкоўнага сабору.

Рэляцыя пра Грунвальдскую бітву змешчана ў частцы, прысвечанай Лівоніі, і захавалася да нашых дзён у некалькіх пазнейшых кампіляцыях,

---

[1] *Denique patrum nostrorum memoria Vladislao gentis regi prudentia et animi magnitudine et religionis cultu memorabili bellum indicunt. Is impigre prelium struit Vitoldumque fratrem suum, magnum Lituanie ducem, in auxilium vocat, virum sui temporis severissimum et astutiarum plenum. Prelium Julio mense committitur, pugnatum est summa contentione; diu Mars dubius fuit, multi hinc atque inde ceciderunt, ad ultimum victi religiosi corruunt. Sexcenti equites natu nobiles ea pugna periere; vulgus ignobile sine numero cesum. Victor Polonus omnem Prusciam invadit, religioni castellum beate Marie tantum remanet. Sed interveniente Sigismundo cesare provincia fratribus restituta est; aurum regi datum; fedus utrinque perpetuo ictum.* - Enee Silvii episcope Senensis de situ et origine Pruthenorum // SRP (далей SRP) / hrsg. von T. Hirsch, M. Töppen, E.Strehlke. Leipzig: Verlag von S. Hirzel, 1870. B. 4. S. 219.

якія ўключылі ў сябе часткі з твораў Пія II. У асноўным змесце гэтыя паведамленні захаваліся ў г. зв. Арундэльскім і Чыгізскім манускрыптах з досыць значнымі разыходжаннямі ў форме, але без істотных адрозненняў.

Чыгізскі варыянт больш шырокі і ўключае дадаткова кароткае апісанне барацьбы паміж Вітаўтам і Тэўтонскім ордэнам, якая папярэднічала паходу саюзных войскаў у Прусію ў 1410 г., адлюстроўваючы, такім чынам, падзеі Жмудскага паўстання 1409 – 1410 г.:

“(Ягайла) …самаму Вітаўту супраць магістра крыжакоў паслаў дапамогу, якая такім чынам разам з літоўцамі выступіўшы, асабіста магістра крыжакоў і лівонцаў пакаралі, шматлікіх забіўшы. Сярод якіх Зігфрыда, камандзіра Рыжскага, чалавека ваяўнічага, ганебна забілі. Таксама няспынна Вітаўт спусташаў усюды ленныя ўладанні крыжакоў і пад Торунем, захапіўшы багатую здабычу, у Літву вярнуўся. Памкнуліся таму паны крыжакі супраць караля Польшчы Ўладзіслава, які супраць саміх братоў падтрымку аказваў, захапілі і спустошылі зямлю Куяўскую, а таксама рэйды рабілі, польскае памежжа спусташаючы агнём і мечам”[2].

У той жа час Чыгізскі манускрыпт змяшчае шмат падрабязнасцей, якія адсутнічаюць у Арундэльскім рукапісы. Так, у ім дакладна вызначана месца бітвы – “поле, званае Фрагенаў” (“campo qui dicitur Fridenaw”), адводзіцца месца, падобна як і ў іншых крыніцах – ананімнай “Хронікі канфлікту…” і “Гісторыі Польшчы” Яна Длугаша, для апісання метэаралагічных з’яваў у дзень бітвы: “…і завільгатнелася таму неба, імгой у той дзень пакрыўшыся, і невялікі дождж абрасіў бітву…”[3]

Прыводзяцца дадзеныя па колькасці войскаў з боку крыжакоў, якім “…каля пятнаццаці тысяч вершнікаў, не лічачы сваіх, на дапамогу ўся Нямеччына, здаўна перапоўненая нянавісці да палякаў, даслала”[4].

---

[2] *(Jagillo) eidem Vitoldo contra magistrum cruciferorum misit suppetias, quibus sic una cum Lytwanis coadunatis ipsum magistrum cruciferorum et Livonienses coercuerunt ac multos occiderunt. ínter quos Sifridum prepositum Rigensem hominem bellicosum neci dederunt. Venerat idem Vitoldus uhique dominia cruciferorum vastando usque Thorunii sicque magna abducens spolia in Lytwaniam est reversus. Commoti ex hoc domini cruciferi contra regem Polonie Vladislaum, qui fratri contra ipsos suppecias dederat, ceperunt terram Cuiaviensem devastare atque in Poloniam incursiones faceré vastantes Polonorum fines per ignem et gladium.* Der Bericht der Chigi’schen Handschrift // SRP / hrsg. von T. Hirsch, M. Töppen, E.Strehlke. Leipzig: Verlag von S. Hirzel, 1870. B. 4. S. 235.

[3] *…a mane itaque illius diei nebulis celum tegentibus ac paucis imbribus irrorantibus ceptum est prelium...* Der Bericht der Chigi’schen Handschrift // SRP. 1870. B. 4. S. 235.

[4] *…prope XL milia equitum preter suos in adiutorium tota Germania prius perosa Polonos miserat.* Der Bericht der Chigi’schen Handschrift // SRP. 1870. B. 4. S. 235.

Варта адзначыць, што гэтыя даныя па колькасці войскаў Тэўтонскага ордэну - адна з самых малых лічбаў у параўнанні з усімі іншымі вядомымі наратыўнымі крыніцамі.

Далей аўтар кампіляцыі, змешчанай у Чыгізскім манускрыпце, прыводзіць дакладныя даныя па стратах шляхты і братоў-рыцараў у Грунвальдскай бітве. Паводле яго паведамленняў у баі загінулі:

– вялікі магістр Тэўтонскага ордэна;

– сорак ордэнскіх комтураў;

– шэсцьсот конных рыцараў Ордэна;

– восемдзесят "госцяў" і наймітаў рыцарскай годнасці.

Пры гэтым паказваецца, што выратавацца ўцёкамі атрымалася "насілу" ("vix") пяці сотням ваяроў розных нацыянальнасцей з усяго войска[5].

На думку аўтара ў дадзеным выпадку маецца на ўвазе таксама выключна рыцарства. Аднак самым дзіўным з'яўляецца паведамленне кампілятара пра тое, што "...палякі сабралі народаў розных найважнейшых пяцьдзесят харугваў [і] з вельмі вялікай здабычай, забранай у забітых, і з трыумфам у Кракаў вярнуліся, ля труны Святога Станіслава, які таксама ў саркафагу знаходзіцца, усе сцягі павесілі, дзе і знаходзяцца па гэты дзень"[6].

Падобныя падрабязнасці паказваюць, што аўтар кампіляцыі, магчыма, сам бачыў вывешаныя трафейныя сцягі крыжакоў у Вавелі, як і магілу Святога Станіслава, г. зн., асабіста бываў у Кракаве; аднак не выключана магчымасць, што ён атрымаў гэтыя звесткі ад удзельнікаў аднаго з польскіх пасольстваў у Прусіі.

Тым не менш, абодва спісы сыходзяцца ў ключавых момантах апісання бітвы. У абодвух выпадках паказваецца, што:

– войскі садпернікаў размясціліся адзін ад аднаго на адлегласці ў 20 стадыяў (3700 метраў);

– войска Вялікага Княства Літоўскага ўступіла ў бой першым, у той час як польскія атрады Ягайла пакінуў у рэзерве;

– войска Вітаўта панесла вялікія страты, яго ваяры "выразаюцца быццам ахвярныя жывёлы", паколькі супраць іх выстаўлены лепшыя рыцары Ордэна;

– напружанасць бітвы спадае з прычыны стомленасці ваяроў;

– Ягайла ўводзіць у бой рэзервовыя польскія харугвы і прымушае крыжакоў кінуцца на ўцёкі;

– у бітве гіне краса рыцарства, уключаючы вялікага магістра, чальцоў вярхоўнага капітула, комтураў і братоў Ордэна.

---

5 Der Bericht der Chigi'schen Handschrift // SRP. 1870. B. 4. S. 236.

6 *Poloni collectis quinquaginta tribus adversariorum pocioribus vexillis cum máxima occisorum preda cum triumpho in Cra-coviam reversi sunt, ad sepulcrum divi Stanislai quod ibidem in arce habetur omnia vexilla suspendentes, que usque in hunc cernuntur diem.* Der Bericht der Chigi'schen Handschrift // SRP. 1870. B. 4. S. 236.

Гэта значыць, мы можам упэўнена сцвярджаць, што абедзве крыніцы ў поўнай меры карэлююцца ў базавай частцы.

У той жа час, параўнанне тэкстаў Энеа Сільвіа Пікаламіні паміж сабой наводзіць на думку, што Чыгізскі спіс змяшчае істотна падпраўленую і ўдакладненую невядомай асобай версію апісання Грунвальда, у той час як аўтарскі тэкст Пія II адпавядае ці блізкі да версіі, прадстаўленай у Арундэльскім рукапісы. Такім чынам, Чыгізскі манускрыпт можа разглядацца як асобная гістарычная крыніца для даследавання падзей бітвы пры Грунвальдзе.

Асоба, якая ўнесла дадаткі ў тэкст Энеа Сільвіа Пікаламіні, выказвае добрую дасведчанасць у падзеях, якія адбываліся ў Прусіі ў 15 ст. У тэксце кампіляцыі мы бачым дваякае стаўленне аўтара да Тэўтонскага ордэна. З аднаго боку ён паказвае рыцараў героямі, якія з гонарам прынялі смерць у баі з “няверным”; з другога – дае высокую ацэнку Ягайлу і Вітаўту. Больш таго, аўтар фактычна апраўдвае ўварванне польскага караля ў Прусію, паказваючы яго цалкам адэкватнай рэакцыяй на дзеянні крыжакоў адносна Польскага каралеўства:

“…крыжакі супраць караля Польшчы Ўладзіслава, які супраць саміх братоў падтрымку аказваў, захапілі і спустошылі зямлю Куяўскую, а таксама набегі рабілі, польскае памежжа спусташаючы агнём і мечам. Уладзіслаў, бачачы, што звівістых змеяў выгадаваў, у гневе вайну супраць крыжакоў, у яго землі уварваўшыхся, аднавіў…”[7]

У адрозненне ад ананімнай “Хронікі канфлікту…” ці “Гісторыі Польшчы”, аўтары якіх падаюць эпізод з уручэннем мечаў польскаму каралю як абразлівы, невядомы кампілятар нічога дзіўнага ў такіх паводзінах вялікага магістра не знаходзіць, заўважаючы, што гэта не больш, чым звычай ваеннага часу.

Апісанне эпізоду з мечамі ў Чыгізскім манускрыпце ў цэлым не супярэчыць паведамленню “Хронікі канфлікту…”, аднак не адпавядае Арундэльскаму спісу, у якім пішацца, што:

“…калі ўжо прыблізна ў дваццаці стадыях адзін ад аднаго войскі стаялі, поўныя надзей, і нецярплівага нораву магістр крыжакоў герольда, які каралю вайну абвясціў і два мечы, [якія павінны былі паказаць], чыя будзе перамога, даслаў у знак магутнасці, з якіх пажадаў, каб [адзін] ворагі

[7] *…cruciferi contra regem Polonie Vladislaum, qui fratri contra ipsos suppecias dederat, ceperunt terram Cuiaviensem devastare atque in Poloniam incursiones faceré vastantes Polonorum fines per ignem et gladium. Vladislaus videns serpentes in sinu nutritos debacchari prelium contra cruciferos terre sue invasores instaurat…* Der Bericht der Chigi’schen Handschrift // SRP. 1870. B. 4. S. 236.

абралі, іншы ж сабе вярнуць загадаў. Прыняў кароль ахвотна нунцыя і, падораны пасрэдніцтвам герольда, адзін меч пакінуў, іншы вярнуў…”[8]

Такім чынам, рэляцыя Чыгізскага манускрыпта пра Грунвальдскую бітву значна пераўзыходзіць пазнавальнай каштоўнасцю і гістарычнай пэўнасцю астатнія паведамленні Энеа Сільвіа Пікаламіні. Зварот да Чыгізскага манускрыпту дазваляе нам растлумачыць шэраг асобных пытанняў, звязаных з бітвай пры Грунвальдзе.

Па-першае, манускрыпт пралівае святло на тактычныя планы бакоў. У той час як Ульрых фон Юнгінген выставіў найлепш узброеных і найбольш дасведчаных рыцараў для першапачатковай сутычкі, а астатніх пакінуў у рэзерве, Ягайла паступіў наадварот, пакінуўшы ў рэзерве красу свайго рыцарства. Дадзеная здагадка пацвярджаецца сведчаннем ананімнай “Хронікі канфлікту…”, якая паведамляе:

“…вялікая частка войскаў прусаў з адборных сваіх атрадаў была пастаўленая насупраць людзей князя Вітаўта, харугвы Святога Георгія і харугвы нашай пярэдняй варты.”[9]

Па-другое, манускрыпт пацвярджае, што першым у бой уступіла крыло, якое складалі харугвы Вітаўта, і панесла цяжкія страты ў сутыкненні з элітнымі атрадамі войска Тэўтонскага ордэну.

Па-трэцяе, крыніца падае каштоўныя звесткі па стратах Тэўтонскага ордэну ў Грунвальдскай бітве, паводле якіх на поле бою палягло з боку крыжакоў семсот дваццаць чалавек рыцарскай годнасці, не лічыўшы прасталюдзінаў, гэта значыць, гараджан і наймітаў нешляхецкага паходжання. Пры гэтым найвялікшыя страты панёс Ордэн, які страціў увесь капітул, вялікую частку комтураў і фогтаў – агульным лікам сорак, шэсцьсот братоў-рыцараў і васальных шляхціцаў, абавязаных несці земскую службу, а таксама восемдзесят госцяў і наймітаў рыцарскага звання.

---

[8] *…postquam prope ad viginti ferme stadia uterque consedit exercitus spe plenus et impatiens more Pruthenicorum magister caduceatorem, qui bellum regi denunciaret et dúos enses, in quis staret victoria, misit facta potestate, ut quem vellet hostis eligeret; alterum sibi remitti iussit. Accepit Vladislaus alacer nuntium donatoque caduceatore uno retento gladio remisit alterum...* Ejusdem Enee Silvii Senensis episcope de Livonia // SRP. 1870. B. 4. S. 233.

[9] *…majorque exercitus Prutenorum ex electis ipsorum aciebus fuere ad invicem ordinati super gentem ducis Vitoldi, banarium sancti Georgii et banarium nostrae primae aciei congressi.* Cronica conflictus Wladislai regis Poloniae cum cruceferis anno Christi 1410 // SRP. 1866. B. 3. S. 437.